**Шаўлякова-Барзенка І.Л. (Мінск)**

# Адукацыйны патэнцыял творчасці Максіма Багдановіча: інавацыйнасць класікі

У айчынным гуманітарным досведзе ідэя пра «літаратурацэнтрызм» беларускай культуры і вызначальную ролю прыгожага пісьменства ў фарміраванні нацыянальнага менталітэту сталася адным з важнейшых канцэптаў. Пры гэтым, неабходна зазначыць, пік «літаратурацэнтрычнасці» беларускай сацыякультурнай прасторы, як правіла, суадносіцца з канцом XIX – пачаткам XX ст. [2, с. 101]. Адначасова даследчыкі фіксуюць адчувальную змену статусу мастацкай літаратуры «ва ўмовах «інфармацыйнага грамадства», адной з найбольш уражлівых праяў якога стаў інтэрнэт як сучасны варыянт гіпермедыя (слова, выяўленчы рад, гукавы тэкст і да т.п.). Слоўнае мастацтва, арыентаванае на высокі культурны і інтэлектуальны ўзровень, перажывае надзвычай цяжкі працэс адаптацыі да масавага спажывання высокіх узораў класікі» [8, с. 22].

Інфарматызацыя ўсіх сфер грамадскага быцця, якая ў сучасным навуковым дыскурсе атаясамліваецца са своеасаблівым «новым рэнесансам», узыходжаннем чалавечай супольнасці да новых вяршынь розуму, у стваральнікаў і даследчыкаў літаратуры, педагогаў-славеснікаў асацыіруецца з усталяваннем чарговых «цёмных стагоддзяў». Звязана гэта з тым, што пералік базавых міфаў пра літаратуру ў першае дзесяцігоддзе XXI ст. дапоўніўся міфам пра непазбежнае забойства *«камп'ютарам»* (тут: сімвал інфармацыйнага грамадства) *«кнігі»* (тут: штандарт мастацтва слова). Між тым, «з камунікатыўнага пункта гледжання пытанне пра носьбіт інфармацыі не з'яўляецца прынцыповым: няма ніякай розніцы, як захоўваецца тэкст і якім чынам забяспечваецца яго даступнасць для чытача»; інакш кажучы, «важна не чытанне кнігі само па сабе, а яе змест, інфармацыйны патэнцыял», «важна не тое, што *чытаюць*, а тое *што* чытаюць» [7, с. 270–271].

Прыгожае пісьменства як частка культуратворчасці нязменна паўстае прасторай праблемнай: і пошук адказаў на «вечныя» пытанні, і спробы вырашэння надзённых канфліктаў і супярэчнасцей маюць вынікам мастацка-вобразную мадэль рэчаіснасці, што набывае канкрэтыку ў кожным новым асобасным яе прачытанні – «пражыванні» – твора. У айчынным педагагічным дыскурсе суаднясенне мэт і задач навучання літаратуры з патрэбамі інфармацыйнага грамадства апошнім часам актуалізуе неабходнасць маштабнага *вяртання да традыцыі*. У сваю чаргу, прадстаўнікі філалагічнай супольнасці выказваюць глыбокую занепакоенасць тым, што класічная спадчына нацыянальнай літаратуры многімі ўважаецца за факт гістарычнай мінуўшчыны, які нібыта страціў сваю актуальнасць для сучасніка і грамадства ў цэлым. М. Мушынскі падкрэслівае выключна вялікае значэнне класічнай спадчыны як універсальнай каштоўнасці менавіта на прыкладзе вывучэння літаратуры ў школе: «Школьная праграма, як вядома, традыцыйна грунтуецца на творах, высокі мастацкі, эстэтычны ўзровень якіх пацверджаны часам. <…> Шматгадовы практычны вопыт наглядна сцвердзіў прадуктыўнасць такога падыходу, эфектыўнасць сталай, паслядоўнай арыентацыі на вяршынныя мастацкія з'явы, на шэдэўры нацыянальнай слоўнай творчасці» [6, с. 235–236].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паказальна, што сучаснае беларускае літаратуразнаўства не звязвае нацыянальную літаратурную традыцыю выключна з творамі фальклору або рамантызму ці рэалізму як «вялікіх стыляў эпохі». Апелюючы да досведу найбольш аўтарытэтных даследчыкаў літаратуры, П. Васючэнка робіць выснову, што «традыцыяналізм у нашым пісьменстве звязаны не толькі з такімі кірункамі, як рэалізм або рамантызм. Вытокі нацыянальнай традыцыі знаходзяцца і ў звязку з нерэалістычнымі, пострамантычнымі літаратурнымі стылямі, такімі, як сімвалізм» [1, с. 19].

Шлях засваення каштоўнасцей культуры сродкамі літаратуры як вучэбнага прадмета – гэта рух ад унутранага дыялогу да знешняга і наадварот. Канцэптуальны грунт навучання літаратуры ў школе мае на ўвазе прадстаўленне вучэбнага матэрыялу ў выглядзе каштоўнасных культуралагічных ведаў, якія фарміруюцца – асобасна пражываюцца і засвойваюцца вучнем – падчас руху ад інфармацыйна-арыенціровачнага этапу да рэфлексіўна-ацэначнага і далей да этапу самарэалізацыі (з дапамогай літаратурных твораў і ў працэсе ўласнай літаратурнай творчасці). Герменеўтычны, інтэрпрэтацыйны тып асэнсавання і «прысваення» мастацкага тэксту, што забяспечваецца шэрагам літаратуразнаўчых прынцыпаў рэалізацыі зместу адукацыі, утрымлівае шырокія магчымасці для самавыяўлення і самаразвіцця асобы.

У гэтым сэнсе творчая спадчына М. Багдановіча – поліфанічны ў ідэйна-змястоўных і мастацка-стылёвых адносінах феномен, што цалкам можа разглядацца як адна з крыніц інавацыйнага развіцця патэнцыялу сучаснай літаратурнай адукацыі.

Калі лічыць літаратурную адукацыю адкрытай сістэмай, з ліку сутнасных характарыстык якой у інфармацыйным грамадстве асаблівае значэнне набывае здольнасць да самаабнаўлення, то найбольш агульная супярэчнасць яе развіцця на сучасным этапе выяўляецца як супярэчнасць паміж дынамічным, іманентна схільным да самаабнаўлення патэнцыялам літаратурнай адукацыі і «статычнымі», «кансерватыўна-скептычнымі» падыходамі да яго ацэнкі і выкарыстання.

У сучасным навуковым дыскурсе пад патэнцыялам (у шырокім сэнсе) маецца на ўвазе сукупнасць наяўных фактараў, якія могуць быць выкарыстаны, задзейнічаны дзеля дасягнення пэўнай мэты. Патэнцыял любой адукацыйнай сістэмы, як правіла, «вызначаецца яе рэсурсамі і магчымасцю іх эфектыўнага выкарыстання»; у сваю чаргу, інавацыйны патэнцыял адукацыйнай сістэмы у найбольш агульным выглядзе сёння прадстаўляецца ў выглядзе «рэсурсаў, неабходных і дастатковых для ўкаранення ў педагагічную сістэму новаўвядзенняў, што забяспечваюць павышэнне якасці адукацыі» [3].

Асэнсаванне патэнцыялу сучаснай літаратурнай адукацыі як структураванай дынамічнай цэласнасці складнікаў – *унутранага* (змест), *рэсурсна*-«*інструментальнага*» (навукова- і вучэбна-метадычныя, нарматыўныя, кадравыя, арганізацыйныя, інфармацыйна-тэхналагічныя, матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы), *выніковага* (павышэнне якасці літаратурнай адукацыі), – па сутнасці, грунтуецца на разглядзе літаратурнай адукацыі як сістэмы, здольнай да самаарганізацыі і (у пэўным сэнсе) да самаразвіцця;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

унутраная структура яе, відазмяняючыся пад уплывам разнастайных (перадусім – сацыякультурных) фактараў, застаецца ўсё ж адносна пастаяннай незалежна ад вонкавых уздзеянняў на сістэму.

Найважнейшым рэсурсным складнікам, здольным забяспечыць паўнавартасную інавацыйнасць развіцця нацыянальнай літаратурнай адукацыі з улікам патрэб і перспектыў інфармацыйнага грамадства, з’яўляецца яе змест. Аналіз адукацыйнай практыкі дазваляе зрабіць выснову, што патэнцыял беларускай літаратурнай класікі наогул і твораў М. Багдановіча ў прыватнасці сёння задзейнічаны з мінімальнай эфектыўнасцю. Бадай, не ў апошнюю чаргу гэта абумоўлена абвастрэннем супярэчнасці паміж характарам (ідэйна-тэматычным, жанравым, моўна-стылёвым) «кадыфікаванага» (замацаванага ў нарматыўных дакументах) зместу літаратурнай адукацыі і спецыфічнымі «чытацкімі чаканнямі» інфармацыйнага грамадства. Знаёмства з мастацтвам слова на розных этапах неперарыўнай літаратурнай адукацыі (ад дашкольнай да адукацыі дарослых) павінна адбывацца на прыкладзе *твораў* выключных ці, па меншай меры, значных у сэнсе эстэтычнай, мастацкай, маральнай вартасці. Аднак у найноўшай інфармацыйнай прасторы запатрабаванымі аказваюцца літаратурна-мастацкія *тэксты*, у лепшым выпадку – «квазітворы», арыентаваныя ў большасці сваёй на мэтавае задавальненне патрэб спажыўца масліту. Відавочна, што і «тэксты», і «творы» выконваюць сваю гісторыка-культурную ролю: першыя ствараюць «эфект прысутнасці» мастацкай літаратуры ў інфармацыйнай прасторы; другія надаюць гэтай інфармацыйнай прасторы эстэтычную, культурную, інтэлектуальную важкасць, як бы забяспечваюць гэтай прасторы яе «рэчыўнасць», «сапраўднасць».

Аксіялагічныя аспекты развіцця інфармацыйнага грамадства па-ранейшаму застаюцца прадметам бурных дыскусій, вынік якіх – вылучэнне ведаў і творчасці ў ліку найвышэйшых каштоўнасцей. Прычым асаблівую важнасць у сучасных умовах «набывае задача развіцця «таленавітага чытача», здольнага арыентавацца ў масе існуючых мастацкіх тэкстаў, рабіць усвядомлены эстэтычны выбар і здабываць багацце мастацкай і ідэйнай інфармацыі, закладзенай у тэксце літаратурнага твора» [7, с. 276]. Парадокс заключаецца ў тым, што здольнасць адрозніваць квазілітаратурны *тэкст* ад мастацкага *твора* становіцца важнай не толькі (і нават не столькі) для «лірыка», колькі для «фізіка»: мастацкая славеснасць, у пэўным сэнсе, ператвараецца ў дасканалы трэнажор для прыхільніка «найноўшай рацыянальнасці», бо дазваляе адрозніваць першаснае ад другаснага, сутнаснае – ад неістотнага, рэальнасць – ад сімулякра, фантома.

Акрэсліваючы асноўныя рысы інфармацыйнага грамадства, амерыканскі даследчык Э. Тофлер называе ў ліку эканамічных, палітычных, ідэалагічных адзнак далейшую індывідуалізацыю асобы пры захаванні салідарных стасункаў паміж людзьмі і супольнасцямі. Шэраг іншых сацыялагічных канцэпцый інфармацыйнага грамадства тэарэтычным грунтам абралі ідэю так званага «антрапалагічнага павароту»: паколькі грамадства няздольнае справіцца з сацыякультурнай нестабільнасцю, варта перайсці «ад сацыяцэнтрызму да антрапацэнтрызму», гэта значыць да «пабудовы сацыяльных канцэпцый, што сыходзяць з асобы самога чалавека» [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Айчынны даследчык літаратуры А. Андрэеў прапануе адрозніваць літаратуру (як мастацтва слова) сацыяцэнтрычнага, індывідацэнтрычнага і персонацэнтрычнага тыпу. На яго думку, у школе выкладалася і выкладаецца літаратура сацыяцэнтрычнага тыпу, арыентаваная на каштоўнасці, больш актуальныя для грамадства, чым для асобы. Сучасная мастацкая славеснасць, у сваю чаргу, даследуе феномен індывідацэнтрызму, апелюючы менавіта да індывідацэнтрычнай карціны свету і свядомасці. У шэрагу прац А. Андрэева ўказваецца на тое, што сучасныя людзі перастаюць бачыць у літаратуры неабходную, актуальную з пункта гледжання духоўных патрэб крыніцу інфармацыі. Пафас персонацэнтрычнай літаратуры (якой, на думку даследчыка, яшчэ няма, можна толькі адшукаць яе «ўкрапленні» ў сацыяцэнтрычных і індывідацэнтрычных творах) звязаны са спробай наблізіцца да гармоніі грамадскага і асабовага пачаткаў на грунце складанага, дыялектычнага ў сваёй аснове светапогляду, са спробай асэнсавання грамадскага праз прызму асобаснага. Крызіс у сістэме навучання літаратуры, паводле А. Андрэева, – прыватны момант змены каштоўнаснай арыентацыі ў маштабах усяго чалавецтва; вектар развіцця культуры – ад сацыяцэнтрызму да персонацэнтрызму.

Сучасны аналіз тэндэнцый развіцця адукацыйнай прасторы падводзіць да высновы, што «творчае навучанне» вымагае «творчага выкладання», стварэння ўмоў для развіцця культуры асобы і вучня, і педагога ў працэсе *сумеснай творчай камунікацыі.* Як заўважае М. Печанко, у літаратурным творы «аўтар як першасны суб’ект выбудоўвае інтэнцыю сэнсу на чытача, і апошні, прысвойваючы яго, становіцца ўдзельнікам стварэння мастацкага свету, у якім ён імкнецца да быцця. Гэтая падзейная сітуацыя выражае гуманітарную прыроду літаратуры і заўсёды ўключана ў школьную літаратурную адукацыю, дзе вучань выступае ў сатворчасці з настаўнікам, як наогул чытач у сатворчасці з аўтарам» [6, с. 60].

Праводзячы аналогію паміж літаратурасофскай канцэпцыяй А. Андрэева і праблемамі інавацыйнага развіцця патэнцыялу літаратурнай адукацыі, маючы на ўвазе неабходнасць структуравання адукацыйнага працэсу па літаратуры перадусім як працэсу творчай камунікацыі, можна з пэўнасцю зазначыць: менавіта творчасць М. Багдановіча, што злучае арыгінальную ды перакладную паэзію, празаічныя і літаратурна-крытычныя творы, урэшце, жыццятворчасць Максіма Кніжніка, – прапануе арыгінальную стратэгію не толькі асэнсавання, але і асваення («125заваёвы») свету, стратэгію, у якой арганічна спалучаныя *ratio* ды *emotio*, інтэлектуальнае і эмацыйна-пачуццёвае, індывідуальнае і тыповае, нацыянальнае і агульначалавечае.

Мастацкая спадчына М. Багдановіча бачыцца ўзорам менавіта той «персонацэнтрычнай» літаратуры, на грунце якой ужо зараз можна даволі эфектыўна вырашаць праблему *сацыякультурнай адаптыўнасці* зместу айчыннай літаратурнай адукацыі. Размова ідзе не пра ахвяраванне аксіялагічнай, эстэтычнай, мастацкай вартасцю зместу (замену «твораў» – «тэкстамі»), але пра канцэптуальны перагляд метадаў, форм, прыёмаў, сродкаў рэпрэзентацыі твора ў адукацыйным працэсе, пра пошук насамрэч дзейсных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

шляхоў ператварэння вучэбнай «інфармацыі» ў творчыя «веды», засвоеныя чалавекам інфармацыйнай эпохі на асобасным узроўні.

**Літаратура**


1. Васючэнка, П. Ад тэксту да хранатопа : артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П. Васючэнка. – Мінск, 2009.
2. Гарадніцкі, Я.А. Мастацкая рэфлексія беларускай літаратуры як фактар актывізацыі творчых пошукаў / Я.А. Гарадніцкі // Літаратура пераходнага перыяду: тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу / М.А. Тычына [і інш.] ; навук. рэд. М.А. Тычына. – Мінск, 2007. – С. 101–160.
3. Ильина, Н.Ф. Развитие инновационного потенциала образовательного учреждения / Н.Ф. Ильина // Вестник ТПГУ. – 2009. – Вып. 5. – С. 53–55.
4. Литвак, Н.В. К вопросу о классификации концепций информационного общества / Н. В. Литвак [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http:/ecsocman.edu.ru/data/2011/02/04/1214886001 /Litvak_01.pdf. – Дата доступу : 07.06.2011.
5. Мушынскі, М.І. Класіка як арганічны складнік літаратурнага працэсу / М.І. Мушынскі // Сучасны літаратурны працэс: пісьменнік і жыццё : матэрыялы Рэсп. навук. канф., Мінск, 11 мая 2006 г. ; рэдкал.: І.Г. Баўтрэль [і інш.]. – Мінск, 2006. – С. 229–237.
6. Печенко, М.Ф. Гуманитарное знание и образование: специфика связи и способы существования / М.Ф. Печенко // Образование и педагогическая наука: тр. Нац. ин-та образования. – Вып. 1. – Концепции и модели ; ред. кол. В.Ф. Русецкий (пред.) [и др.] – Минск, 2007. – С. 55–71.
7. Русецкий, В.Ф. Чтение и образовательный процесс в условиях информационного общества / В.Ф. Русецкий // Зборнік навуковых прац Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. – Вып. 8 ; рэдкал. : А.І. Таўгень (гал. рэд.) [і інш.] / ДУА «Акад. паслядыплом. адукацыі». – Мінск, 2010. – С. 268–277.
8. Тычына, М.А. Феномен пераходнага перыяду: праблемы тыпалогіі / М.А. Тычына // Літаратура пераходнага перыяду: тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу / М.А. Тычына [і інш.] ; навук. рэд. М.А. Тычына. – Мінск, 2007. – С. 6–100.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ